# Л І П Е Н Ь

## 10 ліпеня

# СЬВЯТОГА АНТОНА КІЕВАПЯЧЭРСКАГА

### ВЯЧЭРНЯ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

(*Тон 4*). Калі боская любоў агарнула цябе, сьвяты ойча Антоне, ты палічыў за ніштo прынады гэтага сьвету. Пакінуўшы бацькаўшчыну, ты пасяліўся на Сьвятой гары і зазьзяў там сярод айцоў дабрадзейнасьцямі. Маліся Хрысту, якому ты пасьвяціў сябе ад маладых гадоў, за прасьвятленьне і збаўленьне душаў нашых.

Калі ты, сьвяты ойча, загарэўся любоўю да Хрыста, ты адвярнуўся ад багацьцяў і прамінальнай славы гэтага сьвету. Выкапаўшы сабе пячору, ты пасяліўся ў ёй, і вёў падзьвіжніцкае жыцьцё, быццам анёл. Дзеля гэтага ты ўдастоіўся ад Бога славы анёльскай. Стоячы разам з імі перад пасадам Хрыста, маліся, Антоне, за прасьвятленьне і збаўленьне душаў нашых.

Калі ты, ойча, прыняў у сэрца боскую любоў, ты ўвайшоў у цёмную пячору, быццам у сьвятліцу. Там узбагаціўся ты ведамі, што пераўзыходзяць розум: бачыць будучыню, быццам цяперашняе, і ўсім пра гэта адкрыта гаварыць. Малі Хрыста, якому ты пасьвяціўся ад юнацтва, за прасьвятленьне і збаўленьне душаў нашых.

Слава ...

(*Тон 6*). Строгае жыцьцё тваё і подзьвігі заўважылі айцы на Сьвятой гары. З Божага натхненьня яны адаслалі цябе у родны край, кажучы: "Ідзі, сыне, каб і там людзі праз цябе пазналі Бога. Вярнуўшыся, ты, сьвяты ойча Антоне, прасьвятліў тваю краіну і стаўся начальнікам збору манахаў, якіх ты прывёў да Хрыста. Малі Госпада, каб ён захаваў нас усіх ад варожых напасьцяў і даў нам збаўленьне.

Цяпер...

*Багародзічны (тон 6).* Радуйся чыстая скарбніца дзявоцтва, радуйся, пачэсная боская краса; радуйся, Дзева, верных збаўленьне; радуйся, Уладарка, Дзева Маці.

*Крыжабагародзічны (тон 6).* Калі Маці Твая і Дзева ўбачыла, як беззаконныя людзі несправядліва прыбівалі Цябе да крыжа, сэрца Яе, як прадказаў Сямён, пранізаў нясьцерпны боль.

**Адпушчальны трапар** *(тон 4)*. Удаліўшыся ад марнотаў сьвету, ты, згодна з евангельскай радаю, пайшоў за Хрыстом і, пажыўшы як анёл, знайшоў ціхае прыстанішча на Афонскай гары. Адтуль, за блаславеньнем айцоў, ты прыйшоў у Кіеў і там закончыў жыцьцё, прасьвятліўшы тваю бацькаўшчыну, паказаўшы многім шлях да валадарства нябеснага і прывёўшы іх да Хрыста. Малі Яго цяпер, Антоне сьвяты, за збаўленьне душаў нашых.

---

**Кандак** *(тон 8)*. Аддаўшы сябе Богу, якога ты з маладосьці больш за ўсё палюбіў, ты пайшоў усьлед за Ім, а гэты прамінальны сьвет палічыў за нішто. Ты зрабіў сабе ў зямлі пячору і ў ёй мужна змагаўся супраць нябачнага ворага і зазьзяў быццам сонца на ўсю зямлю. Адтуль ты перайшоў да нябесных харомаў. Сёньня, стоячы з анёламі перад пасадам Уладара, памятай аб нас, якія шануем памяць тваю і клічам: Радуйся, Антоне, ойча наш.

## 11 ліпеня

## СЬВЯТОЕ МУЧАНІЦЫ АЎХІМІІ ЎСЯХВАЛЬНАЕ

### ВЯЧЭРНЯ

**На "Госпадзе, Цябе клічу":**

*Тон 4*). Упрыгожыўшы душу тваю дабрадзей-насьцямі дзявоцтва і крывёю мучаніцтва, ты, мучаніца слаўная, аддала сябе Творцу твайму, які захаваў цябе нятленнаю навекі. Цяпер ты, усяхвальная, жывеш у радасьці разам з хорамі анёлаў і арханёлаў, прарокаў, апосталаў і мучанікаў.

Цябе прывязвалі да кола, разьдзіралі зьвярамі і кідалі ў агонь і ваду. Умацаваўшы розум твой Боскім Духам, ты, дзева, у крыві тваёй мужна патапіла ўладара цемры і ўзьнялася да нябесных харамаў, прынёсшы, быццам пасаг, Жаніху твайму цярпеньні твае.

Памёршы, ты, мучаніца, застаешся вечна жывой; праліўшы кроў сваю на хвалу Госпаду, ты напаіла верных і прасьвятліла іх веданьнем, а няверных ворагаў патапіла. Дзеля гэтага скрутак Боскі царкоўных догмаў табе давяраецца, каб ты іх вечна трымала і ахоўвала.

Слава ...

(*Тон 6*). Дабрадзейная і са сьветлым розумам, ты праліла алей сьвяты ў сэрцы верных; зазьзяўшы з Усходу, быццам раньняя

зорка, ты прасьвятліла збор сьвятых айцоў. Не пераставай маліцца, Аўхімія ўсяхвальная, за збаўленьне душаў нашых.

Цяпер...

**Вершапесьні** *з актойха належнага тону*

Слава...

(*Тон 8*). Хай кожны язык пяе хвалу ўсяхвальнае Аўхіміі; хай кожны род і век — юнакі і дзевы, — уславіць дзеву і мучаніцу Хрыстовую. Яна, узмоцненая Законам Божым, мужна адкінула жаночую слабасьць, і цярпеньнямі сваімі перамагла мучыцеля ворага. Цяпер, упрыгожаная нябесным і боскім вянцом, яна моліць Жаніха свайго і Бога дараваць нам веліч зьмілаваньня.

Цепер...

**Адпушчальны трапар**

***Мучаніцы*** *(Тон 4).* ЯгнёТваё, Ісусе, Аўхімія, кліча моцным голасам: "Цябе, Жаніх мой, люблю і, Цябе шукаючы, мукі пераношу і расьпінаюся з Табою, і пахаваньне прымаю ў хрышчэньні Тваім, і цярплю за Цябе, каб панаваць з Табою, і паміраю за Цябе, каб з Табою жыць; Ты ж прымі мяне, як ахвяру чыстую, што з любоўю прыносіцца Табе." Малітвамі яе, Міласэрны, збаў душы нашыя.

## 13 ліпеня

## САБОР АРХАНЁЛА ГАБРЫЕЛЯ

### ВЯЧЭРНЯ

**На "Госпадзе, Цябе клічу":**

(*Тон 1*). Габрыель вялікі, дух, што Бога бачыць тварам у твар, прамяністы і збавенны, узіраецца на Трохсонечнае Сьвятло і разам з усімі нябеснымі сіламі пяе дзіўную песьню хвалы Богу, молячы Яго дараваць душам нашым супакой і багацьце зьмілаваньня.

Вялікая тайна, анёлам раней няведамая, і перад вякамі скрытая, табе, Габрыель, адзінаму была давераная. І ты, прыйшоўшы ў Назарэт, абвясьціў яе адзінай Чыстай. Разам з ёю

маліся Богу, каб Ён дараваў душам нашым супакой і багацьце зьмілаваньня .

Поўны сьветласьці, ты, Габрыелю слаўны, анёлаў начальніча, чыніш волю і выконваеш загады ўсемагутнага. Збаўляй тых, што з любоўю шануюць цябе, і прасі безупынку Бога дараваць душам нашым супакой і багацьце зьмілаваньня.

Слава ... цяпер ....

(*Тон 6*) Арханёл Габрыель быў пасланы з неба абвясьціць Дзеве радасную вестку зачацьця Яе. Прыйшоўшы ў Назарэт, ён падумаў у сабе, дзівячыся цуду: "Як гэта здарылася, што Той, каго нябёсы зьмясьціць ня могуць, родзіцца ад Дзевы;Той, хто мае за пасад неба, і зямлю за падножак для ног сваіх, у дзявочым улоньні зьмяшчаецца; Той, на якога шасьцікрылыя сэрафімы і шматвокія хэрувімы зірнуць ня сьмеюць, словам адным ад Дзевы цела прыняць захацеў, сам будучы Божым Словам? Дык чаго ж я стаю і не кажу Дзеве: Радуйся, поўная ласкі, Госпад з Табою; радуйся, Чыстая Дзева, Нявеста беззаганная; Радуйся, Маці Жыцьця; блаславёны плод улоньня твайго!"

**Адпушчальны трапар** *(Тон 4).* Нябесных сіл ваявода, мы недастойныя безустанку молім цябе, каб ты ахінуў нас тваімі малітвамі і пакрыў ценем крыл духоўнае твае славы, ахоўваючы нас, якія прыбягаем да цябе, клічучы: "Ад бедаў выбаў нас, начальніча вышніх сіл!"

## Нядзеля 13-19 ліпеня

## НЯДЗЕЛЯ СЬВЯТЫХ АЙЦОЎ ПЕРШЫХ ШАСЬЦІ САБОРАЎ

### ВЯЧЭРНЯ

**На "Госпадзе, Цябе клічу":** *сем песьняў нядзельных належнага тону і тры Айцоў:*

(*Тон 6*). Перад заранкай Ты, Спрадвечны, нарадзіўся ад Айца без маці; і хоць Арый дзёрзка называе Цябе стварэньнем а не Богам — бяздумна зьмешваючы Тварца з творамі Яго і рыхтуючы сабе нязгасны агонь, — Сабор у Нікеі прагаласіў Цябе Сынам Божым, роўнадастойным з Айцом і Духам.

Разадраную Хрыстовую вопратку, пашарпаную зубамі зьвяроў, вы, пачэсныя айцы, мудра сшылі зноў, ня могучы бачыць

Яго непакрытым — як некалі Сім і Яфет бацьку, — і гэтым пасаромілі Арыя і аднадумцаў яго.

Македаніянаў і нэстарыянаў, эўтыхіянаў і дыяскарыянаў, апалінарыянаў, савеліянаў і севірыянаў — ваўкоў лютых у авечай шкуры, — вы, як сапраўдныя пастыры, адагналі ад Збавіцелевага стада, садраўшы з іх авечую маску. Дзеля гэтага шануем вас.

Слава...

(*Тон 6*). Услaвім сёньня баганосных айцоў, тайныя трубы Духа, што пасярод царквы засьпявалі стройную песьню багаслоўя пра адзіную і неразьдзельную прыродай і боствам Тройцу; будучы пераможцамі Арыя і абаронцамі верных, яны моляцца безустанку Госпаду за збаўленьне душ нашых.

Цяпер...: *Дагматык належнага тону*

**Чытаньне кнігі Быцьця** (*14:14-20*)

Аўрам, пачуўшы, што ягоны сваяк Лот патрапіў у палон, узяў з сабою трыста васемнаццаць найбольш дасьведчаных хатніх сваіх і кінуўся ў пагоню аж да Дана. Уночы, падзяліўшы людзей сваіх на загоны, ён напаў на ворагаў і разьбіў іх, а потым гнаўся за імі аж да Хобы, што на захад ад Дамаску. Такім чынам ён адабраў усю маёмасьць і вярнуў назад Лота з яго дабром, жонкамі і слугамі. Калі Аўрам вяртаўся з перамогі над Кедарлёамерам і царамі, што былі з ім, цар Садомскі выйшаў яму насустрач да даліны Шавэ, гэта значыць Каралеўскай. І Малхісадэк, цар Салімскі, вынес хлеб і віно — бо ён быў сьвятаром Бога Усявышняга, — і бласлaвіў Аўрама, кажучы: "Хай Бог Усявышні, Тварэц неба і зямлі, бласлaвіць цябе, Аўраме; і хай будзе бласлaвёны Бог Усявышні, які аддаў ворагаў тваіх у рукі твае".

**Чытаньне кнігі Другога Закону** (*1:8-17*)

У той час сказаў Майсей сыном Ізраілевым: "Вось даю вам зямлю — ідзеце, вазьмеце яе сабе ў спадчыну, якую Госпад кляўся даць айцом вашым Абрагаму, Ізааку і Якубу, і нашчадкам іх. У той час я сказаў вам: я не змагу адзін узяць на сябе вашыя цяжкасьці. Госпад Бог ваш размножыў вас — сёньня вас, як зорак у небе. І няхай Госпад, Бог айцоў вашых, размножыць вас яшчэ ў тысячу разоў і бласлaвіць вас, як абяцаў. Але як жа мне аднаму насіць вашыя цяжкасьці, вашы клопаты і непаладкі? Дык абярыце сабе спаміж каленаў вашых мужоў разумных, паважных і дасьведчаных, і я пастаўлю іх вам начальнікамі. І вы мне адказалі:

добрую рэч хочаш зрабіць. Дык вось я ўзяў старшыняў з каленаў вашых, мужоў мудрых, паважных і дасьведчаных, і паставіў іх тысячаначальнікамі, сотнікамі, пяцідзесятнікамі і дзесятнікамі, каб былі кіраўнікамі ў каленах вашых. У той самы час я даў такі наказ судзьдзям вашым: Выслухоўвайце братоў вашых, судзеце справядліва справу кожнага, з братам яго ці з чужынцам. Калі судзіце, не глядзеце на аблічча, выслухоўвайце аднолькава малога і вялікага, ня бойцеся нікога, бо суд Божы ёсьць".

**Чытаньне кнігі Другога Закону** (*10:14-21*)

У той час сказаў Майсей сыном Ізраілевым: "Неба і нябёсы нябёсаў, зямля і ўсё, што напаўняе яе, належаць Госпаду Богу твайму. Толькі да айцоў вашых прыхіліўся Госпад і палюбіў іх, і выбраў іх і іхняе патомства сярод іншых народаў — аж па сёньняшні дзень. Дык абрэжце сэрцы вашыя, і няхай шыі вашыя ня будуць цьвёрдымі. Бо Госпад Бог ваш — Бог над багамі і ўладар над уладарамі, Бог вялікі, магутны і страшны, які не зважае на асобу і не прымае падарункаў; Ён чыніць справядлівасьць сіраце і ўдаве, мілуе чужынца, даючы яму хлеб і вопратку. Вы таксама любеце чужынцаў, бо самі былі чужынцамі ў зямлі Ягіпскай. Госпада Бога твайго бойся, Яго трымайся, Яму служы і імем Ягоным кляніся. Ён — твая слава, Ён Бог твой, што ўчыніў для цябе вялікія і страшныя рэчы, якія ты бачыў на ўласныя вочы".

**Вершапесьні**: *нядзельныя належнага тону.*

Слава ...

(*Тон 4*). Сёньня ўся грамада верных набожна сьвяткуе пачэсную памяць баганосных айцоў, што з усіх куткоў сьвету сабраліся ў Нікеі. Яны багамудра абверглі нязбожную навуку Арыя і саборна адлучылі яго ад Паўсюднай Царквы. У Вызнаньні Веры яны дакладна і праўдзіва навучылі нас верыць у адзінасутнага і спрадвечнага Сына Божага. Дзеля гэтага мы, ідучы за іхнім боскім навучаньнем, з непахіснай верай пакланяемся разам з Айцом Сыну і Духу ўсесьвятому, у еднасьці Боства Тройцы адзінасутнай.

Цяпер...

(*Тон 4*). Глянь прыхільна на маленьні слуг тваіх, Усячыстая, і адхілі ад нас цяжкія напасьці, выбаўляючы нас ад усякага смутку, бо ў табе адзінай маем цьвёрдую і пэўную абарону, і на тваё заступніцтва спадзяемся. Дык ня дай нам пасаромецца, Уладарка, калі мы зьвяртаемся да цябе, але адгукніся хутка на

просьбы тых, што ў веры клічуць: Радуйся, Уладарка, дапамога, радасьць, ахова і збаўленьне душ нашых.

**Адпушчальныя трапары**

***Трапар нядзельны належнага тону***

Слава...

***Трапар Айцоў** (тон 8).* Ты бесканечна слаўны, Хрысьце Божа наш, бо Ты ўстанавіў айцоў нашых сьветачамі на зямлі, і цераз іх прывёў нас да веры праўдзівай. Усеміласьцівы Госпадзе, слава Табе.

Цяпер...

***Багародзічны** (тон 8:).* Ты, што дзеля нас нарадзіўся ад Дзевы і на крыжы пацярпеў, сьмерцю зьнічыўшы сьмерць і паказаўшыся Богам ва ўваскрасеньні Тваім, не пагардзь творамі рук Тваіх, пакажы чалавекалюбства Твае, Міласэрны, прымі малітвы за нас Багародзіцы, якая нарадзіла Цябе, і збаў, Збавіцелю добры наш, людзей бездапаможных.

## ЮТРАНЬ

**Пасьля "Госпад — Бог...":** *трапары як на вячэрні (гл. вышэй)*

*Далей служба нядзельная належнага тону.*

**Канон**

*Ірмасы нядзельнага канону належнага тону. і катавсія "Адшчыню вусны мае..."*

*Пасьля трэцяй песьні кандак і ікас нядзельныя і наступныя сядальныя песьні*

(*Тон 4*). Вы, блаславёныя і баганосныя айцы, явіліся сьвету як ясныя сьветачы праўды Хрыстовае, высушылі агідныя і шкодныя ерасі, і пагасілі хваляваньні нязбожных. Цяпер, як святаначальнікі Хрыстовыя, моліцеся за наша збаўленьне.

Слава... цяпер...

Ты, Усячыстая, абнавіла Боскім сынараджэньнем Тваім сатлелую людзкую прыроду, і ўзьняла яе ад сьмерці да нятленнага жыцьця. Дзеля гэтага мы ўсе бласлаўляем Цябе завем шчасьлівая, як Ты, Дзева праслаўленая, сама прадказала.

*Пасьля шостай песьні:*

***Кандак Айцоў** (тон 8).* Апосталаў прапаведаваньне і айцоў навучаньне ўмацавалі веру праўдзівую ў Царкве, і яна, адзеўшыся ў вопратку праўды, вытканую з нябеснага багаслоўя, праўдзіва навучае і славіць набожнасьці вялікую тайну.

*Ікас.* Мы чуем Царкву Божую, якая моцным голасам кліча: "Хто мае смагу, хай прыходзіць да мяне і п'е з чашы, якую трымаю, бо гэта чаша мудрасьці. Я чэрпаю ваду словам праўды, ваду не пярэчаньня але вызнаньня. П'ючы яе, новы Ізраіль бачыць Бога, які кажа: "Гляньце, гэта Я сам, нязьменны; Я Бог першы і назаўжды, і апроч Мяне іншага няма і ня будзе". Дык тыя, што прычашчаюцца ёю, насыцяцца і ўсхваляць пабожнасьці вялікую тайну.

*Пасьля "Больш годную пашаны..." песьня дзевятая нядзельная і наступная.*

(*Тон 6*). Бога людзям немагчыма бачыць, на Яго хоры анельскія глянуць ня сьмеюць; дзякуючы Табе, Усячыстая, Слова, што сталася чалавекам, зьявілася людзям. Дзеля гэтага разам з нябеснымі сіламі ўзьвялічваем Яго і Цябе шчасьліваю завем.

*Верш.* Сьвятыя і баганосныя айцы, маліце Бога за нас.

Не належыць нічога мяняць — дадаваць ці адкідаць — у боскім паданьні нашай веры, у якой мы ахрышчаныя. А тыя, што ўносяць зьмены, будуць асуджаныя.

*Верш.* Сьвятыя і баганосныя айцы, маліце Бога за нас.

Хай сэрцы нашыя напоўняцца радасьцю, сьвяткуючы памяць айцоў сьвятых събораў. Дзякуючы ім мы ўбачылі сьвятло правай веры. Яны явіліся сьветачамі, што сваім навучаньнем паказлі ўсім шлях да здабыцьця праўдзівай навукі.

*Верш.* Сьвятыя і баганосныя айцы, маліце Бога за нас.

Папросім ачышчэньня душаў і пастараемся пражыцьжыцьцё наша пабожна, каб быць супольнікамі сьвятых айцоў, якія адкрылі нам, дзецям сваім, багацьце праўдізвай навукі.

Слава.. цяпер...: Бог з улоньня Твайго зазьзяў, Маці Божая, абагавіў род людзкі, і удастоіў сваёй славы і зрабіў насьледнікамі сваімі тых што заўжды вызнаюць Цябе сапраўды Багародзіцаю.

Экзапастыляр: *нядзельны*

Слава...: Сьвяткуем сёньня памяць боскіх айцоў, і малітвамі іх молім Цябе, Усяшчодры: выбаў людзей тваіх ад усіх шкодных ерасяў, Госпадзе, і ўдастой іх славіць Айца, Слова і Ўсесьвятога Духа.

Цяпер...: Радуйся, Божая палата; радуйся, гара ацененая; радуйся, незгарльны куст; радуйся пасад славы; радуйся, Бопскае застольле; радуйсшя , ручка залатая; радуйся, сьветач ясну; радуйся, лёгкая хмара, Дзева Маці Марыя.

Пахвальныя псалмы

*Чатыры песьні нядзельныя належнажчга тону і чатыры наступныя:*

(*Тон 6*). Пачэсныя айцы, сабраўшы ўсе духоўныя веды і разгледзеўшы іх у Боскім Духу, багананатхнёна напісалі нябеснае і пачэснае вызнаньне веры, у якім ясна навучаюць, што Слова субеспачатнае і адзінасутнае з Айцом. У гэтым яны — блаславёныя і слаўныя, і сапраўды багамудрыя, — пайшлі ўсьлед за апостальскім навучаньнем. (*Двойчы*)

*Верш.* Блаславёны Ты, Божа айцоў нашых, і імя Тваё слаўнае і ўсяхвальнае давеку.

Хрыстовыя прапаведнікі і блаславёныя настаўнікі евангельскіх навучаньняў і пабожных паданьняў, асьветленыя духоўным зьзяньнем Сьвятога Духа, мудра і баганатхнёна ў кароткіх словах аб'явілі звышпрыроднае багаслоўе . Прыняўшы з вышыні адкрыцьцё праўдаў, і прасьвятліўшыся імі, яны аб'ясьнілі нам Богам аб'яўлен ую веру.

*Верш.* Зьбярыце Яму ўсіх сьвятых Яго.

Боскія пастыры і сапраўдныя слугі Хрыстовыя, сабраўшы ўсё пастырскае дасьведчаньне, і загарэўшыся справядлівым гневам, адагналі прашчаю Духа злосных і згубых ваўкоў, заражаных сьмяротнай немаччу, і адлучылі іх ад царкоўнай супольнасьці.

Слава...

(*Тон 8*). Сьвятыя айцы, сабраўшыся з усіх куткоў зямлі, навучылі нас верыць у адзіную сутнасьць і прыроду Айца, і Сына, і Духа Сьвятога. Яны перадалі Царкве тайну багаслоўя. Дзеля гэтага мы шануем і блаславляем іх, кажучы: О Боскае войска, дабрамоўныя рыцары з Гасподняга стану; зоркі ясныя духоўнага неба; тайнага Сыёну непахісныя стаўпы; поўныя духмянасьці кветкі райскія; залатыя вусны Слова; пахвала Нікеі; краса сусьвету, маліцеся няспынна за душы нашыя.

Цяпер...

Найблаславёная Ты, Багародзіца Дзева...

## ЛІТУРГІЯ

***Трапар нядзельны належнага тону***

***Трапар Айцоў*** *(тон 8).* Ты бесканечна слаўны, Хрысьце Божа наш, бо Ты ўстанавіў айцоў нашых сьветачамі на зямлі, і цераз іх прывёў нас да веры праўдзівай. Усеміласьцівы Госпадзе, слава Табе.

Слава...

***Кандак Айцоў*** *(тон 8).* Апосталаў прапаведаваньне і айцоў навучаньне ўмацавалі веру праўдзівую ў Царкве, і яна, адзеўшыся ў вопратку праўды, вытканую з нябеснага багаслоўя, праўдзіва навучае і славіць набожнасьці вялікую тайну.

Цяпер...

Апякунка хрысьціян бездакорная...

***Пракімен*** *(Дан. 3:26,27).* Блаславёны і ўсехвальны Ты, Божа айцоў нашых, і імя Тваё хай славіцца на векі.

*Верш.* Бо справядлівасьць Твая яўная ва ўсім, што Ты ўчыніў для нас.

***Апостал***: Гэб 13:7-17

***Алілуя*** *(Пс 49:1,5).* Бог багоў, Госпад, кліча зямлю ад усходу да захаду.

*Верш.* Зьбярыце перада мною сьвятых маіх, якія замацавалі запавет мой ахвяраю.

***Евангельле***: Мц 5:14-19

***Прычасьнік.*** Хваліце Госпада з нябёсаў, хваліце Яго на вышынях.

Усклікніце, праведнікі, Госпаду ў радасьці: хвала пасуе праведным. Алілуя, алілуя, аллілуя.

19 Ліпеня

## СЬВЯТОЕ МАЦІ НАШАЕ МАКРЫНЫ

### ВЯЧЭРНЯ

**На** 'Госпадзе, Цябе клічу...':

(*Тон 4*). Сьвятая маці Макрына, ты зьберагла нятленным дзявоцтва ў чыстым жыцьці, раздала маёмасьць бедным і пакінула гэты сьвет і яго прынады, спаўняючы запавет Хрыста, усьлед за якім ты пайшла. Дзеля гэтага даравў табе нябесную радасьць Ісус Чалавекалюбец і Збавіцель душ нашых.

Сьвятым жыццём тваім ты мудра навучыла нас, што такое несьмяротная душа. Ты ня толькі высьцерагалася усяго грэшнага, але і адмовілася ад людзкіх добрых сувязяў, каб магчы зьявіцца беззаганнаю перад Жаніхом Хрыстом — чыстаю, бязьвіннаю і мілаю Богу.

Тваё сьветлае аблічча, усяхвальная Макрына, зьзяе і пасьля сьмерці. Так Хрыстос уславіў цябе, як сваю дзеву — нявесту, сьветлую, спагадлівую і закаханую ў Богу. Анельскім жыцьцём тваім на зямлі ты спадабалася Госпаду.

Слава ...: (*Тон 6*). Прыйдзіце, набожныя людзі, гляньце на цудоўны кветнік дабрадзейнасьцяў, насаджаны Госпадам, а не чалавекам. Падзіўляйма душу блаславёнае маці Макрыны, каб і нашы душы захапіліся красой кветак і запахам раю. Бо адтуль цякуць рэкі Божай ласкі на ўвесь сьвет, і між лілеямі там пасецца Ягнё Божае. Разам з ёю паклонімся Яму.

Цяпер...: ***Багародзічны** (тон 6).* Радуйся чыстая скарбніца дзявоцтва, радуйся, пачэсная боская краса; радуйся, Дзева, верных збаўленьне; радуйся, Уладарка, Дзева Маці.

***Крыжабагародзічны** (тон 6).* Калі Маці Твая і Дзева ўбачыла, як беззаконныя людзі несправядліва прыбівалі Цябе да крыжа, сэрца яе, як прадказаў Сямён, пранізаў нясьцерпны боль.

***Адпушчальны трапар** (тон 2).* Бачыўшы сьмерць мужа твайго, і пазнаўшы няпэўнасьць і марнасьць гэтага сьвету, ты абяцала сябе несьмяротнаму Жаніху, пастом і дабрадзейным жыцьцём стараючыся заслужыць на Ягоную любоў. Дзеля гэтага сёньня з анёламі радуецца, блаславёная Макрына, дух твой.

20 ліпеня

# СЬВЯТОГА ПРАРОКА ІЛЬЛІ

## ВЯЧЭРНЯ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

(*Тон 1*). Госпадзе міласэрны, Ты на вогненннай калясьніцы ўзьняў Ільлю Тэсьбіцяніна. Малітвамі ягонымі збаў нас, якія з вераю славім Цябе і ўрачыста спраўляем ягоную сьвятую і збавенную памяць.

Не ў землятрусе, а ў лагодным подыху ветру ўбачыў ты, Багавідча Ільля, прыйсьце Божае, якое цябе калісь прасьвятліла. Сеўшы на калясьніцу, ты, боганатхнёны прароча, у дзівосны спосаб быў узьняты на неба.

Ты, мудры Ільля, палаючы Божай руплівасьцю, выгубіў нязбожных паганскіх сьвятароў,словам тваім устрымаў дождж з неба на зямлю, і Елісея напоўніў падвойнаю ласкаю Божаю, аддаўшы яму свой плашч.

(*Тон 2*). Два сьветачы зазьзялі на ўвесь сьвет, Ільля і Елісей. Першы з іх словам сваім зачыніў дождж з неба, выкрыў крывадушнасьць цара і на калясьніцы ўзьнёсься на неба. Другі аздаравіў бясплодныя воды і, атрымаўшы падвойную ласку, разьдзяліў воды Ярданскія. Цяпер абодва яны прабываюць з анёламі і моляцца за збаўленьне душ нашых.

Быццам моцным ветрам ты, Ільля Тэсьбіцянін, быў узьняты на вогненнай калясьніцы да неба; Бог даў табе палымяную ласку цудаў і ўчыніў цябе нятленным, ня даўшы табе бачыць сьмерці, пакуль не прадскажаш канца ўсім.Дык прыйдзі цяпер, даючы нам перасьцярогу тваімі навучаньнямі.

Сьветач нязгасны царкоўны, распалены боскай руплівасьцю, Ільля прароча, ты зачыніў дождж з неба, і быў кормлены воранам, выкрыў крывадушнасьць цара, і ілжывых прарокаў умярцьвіў; ты загадаў агню зыйсьці з неба і забіў двух нязбожных начальнікаў; накарміў удосталь удаву аліваю і малою жменяю мукі, і сына яе малітваю ўваскрасіў; на вадзе ты запаліў агонь, і Ярдан, быццам па сушы, перайшоў; і, ўзьнёсшыся на вогненнай калясьніцы да неба, даў Елісею падвойную ласку. Маліся безустанку Богу за збаўленьне душ нашых.

Слава ...

(*Тон 6*). Прыйдзіце, верныя, каб, сабраўшыся ў сьвятыні пачэсных прарокаў, засьпяваць стройную песьню на славу Хрыста Бога нашага, які праславіў іх; радасна ў вясельлі ўсклікнем: Радуйся, зямны анёле, і чалавеча нябесны, Ільля знамяніты; радуйся, пачэсны Елісею, што атрымаў ад Бога падвойную ласку.Радуйцеся, добрыя заступнікі, абаронцы і лекары душ і целаў Хрысталюбных людзей. Ад усякай напасьці варожай і непрхільных абставін, і ад усіх бедаў выбаўце тых, што з вераю спраўляюць урачыста памяць вашу.

Цяпер....

*Дагматык (тон 6).* Хто Цябе не назаве шчасьліваю, Найсьвятая Дзева; хто ня будзе славіць, Чыстая, мацярынства Тваё? Адзінародны Сын, што спрадвеку зазьзяў ад Айца, ад Цябе, прыняўшы цела, у невыказны спосаб нарадзіўся. Будучы праўдзівым Богам, Ён стаўся праўдзівым чалавекам дзеля нас, непадзельны на дзьве асобы, але ў дзьвюх нязьлітных прыродах пазнавальны. Малі Яго, Чыстая і Блаславёная, даць зьмілаваньне душам нашым.

**Чытаньне трэцяй кнігі Царстваў** (*17:1-23*)

Было слова Гасподняе да прарока Ільлі Тэсьбіцяніна, і той сказаў Ахабу: "Як жывы Госпад Бог сіл, Бог Ізраіля, якому служу, ня будзе у гэтыя гады ні расы ні дажджу, аж пакуль я не скажу". І Госпад прамовіў да Ільлі, кажучы: "Ідзі адсюль на ўсход, і затрымайся каля ручая Кэрыт, што перад Ярданам, і будзе вада ў ручаі, якую будзеш піць, і воранам загадаю карміць цябе там". Ільля пайшоў і зрабіў, як загадаў яму Госпад, і затрымаўся ля ручая Кэрыт перад Ярданам; і вораны прынасілі яму хлеб раніцай і мяса вечарам, і ён піў ваду з ручая. Але пасьля нейкага часу ручай высах, бо не было дажджу на зямлі. І Госпад сказаў Ільлі: "Устань і ідзі ў Сарэпту Сыдонскую, і заставайся там, бо я загадаў адной жанчыне ўдаве карміць цябе". І, устаўшы, пайшоў ён у Сарэпту Сыдонскую. Калі ён падыходзіў да брамы гораду, нейкая ўдава зьбірала там сабе дровы; дык ён паклікаў яе і сказаў: "Дай, прашу цябе, крыху вады ў кубку, каб мне напіцца". Яна пайшла, каб прынесьці, я ён клікнуў ёй усьлед: "Прынясі і кусок хлеба ў руцэ тваёй, каб мне зьесьці". Жанчына ж адказала: "Як жыве Госпад Бог мой, няма ў мяне больш печыва, а толькі жменя мукі ў посудзе і крыху алівы ў гляку: і вось я назьбіраю дроваў і пайду падрыхтаваць мне і сыну майму страву, каб нам пад"есьці, а пасьля памерці". Ільля ж кажа ёй: "Ня бойся, але ідзі і не рабі так, як ты казала, але сьпячы перш маленькі праснак і прынясі мне: сабе ж і дзеткам тваім зробіш пазьней. Бо Госпад Бог Ізраіля кажа: Посуд з мукою ня будзе пустым, і гляк з аліваю не апарожніцца пакуль Госпад не пашле дождж на зямлю".Жанчына пайшла і

зрабіла, як сказаў ёй Ільля; і дала яму, і еў ён, і яна і сын яе. І так было кожны дзень: посуд з мукою не апусьцеў і гляк з аліваю не апаражніўся, згодна з абяцаньнем, якое даў Госпад цераз Ільлю. Хутка пасьля здарылася, што захварэў сын гэтай жанчыны, гападыні дому, і хвароба яго была так цяжкая, што ён перастаў дыхаць. Тады сказала яна Ільлі: "Што ты, чалавеча Божы, хочаш ад мяне? Ці ты прыйшоў на тое, каб прыпомніць мне маю віну і ўмарыць сына майго?". І кажа Ільля жанчыне: "Дай мне сына твайго". Тады ўзяў ён яго ад яе і, занёсшы ў сьвятліцу, дзе сам прабываў, палажыў на сваім ложку. І ўсклінуў Ільля да Госпада, кажучы: "Гора мне, Госпадзе Божа мой! Ці Ты нават на ўдаву, у якое я жыву, наводзіш няшчасьце і дапушчаеш сьмерць сына яе?". І дыхнуў на дзіця тройчы і зноў ускліқнуў да Госпада, кажучы: "Госпадзе Божа мой! Прашу Цябе, хай душа гэтага дзіцяці вернецца да яго!". І Госпад пачуў голас Ільлі, і душа дзіцяці вярнулася да яго, і яно ажыла. Тады Ільля ўзяў дзіця, вынес са сьвятліцы гэтага дому і аддаў маці. І кажа ёй Ільля: "Глядзі, сын твой жывы". І кажа жанына Ільлі: "Цяпер ведаю, што ты сапраўды чалавек Божы, і вуснамі тваімі гаворыць Госпад".

**Чытаньне трэцяй кнігі царстваў** *(18:1,17-19:16)*

У трэці год панаваньня Ахаба, Госпад сказаў Ільлі: "Ідзі і пакажыся Ахабу, бо Я пушчу дождж на зямлю". Ахаб, убачыўшы Ільлю, сказаў: "Гэта ты, што зьдзекуешся над Ізраілем". Але Ільля адказаў: "Не я зьдзекуюся над Ізраілем, але ты і дом айца твайго, бо вы пакінулі Госпада Бога свайго, і пайшлі на службу паганскім ідалам. Дык цяпер дай загад, каб увесь Ізраіль сабраўся каля мяне на гары Кармэльскай, а таксама трыста пяцьдзесят прарокаў Бааля і чатырыста мерзкіх прарокаў, сталаўнікоў Езабэлі". І Ахаб даў загад усім ізраільцянам, як сказаў Ільля, і сабраў усіх прарокаў на гару Кармэльскую, і прывёў іх да Ільлі. І сказаў Ільля ім: "Як доўга будзеце кульгаць на абедзьве нагі? Калі Госпад ёсьць сапраўдным Богам, дык пакланяйцеся Яму, калі ж Бааль, то яму служыце! ". На гэта не адказалі яму ні словам. Тады Ільля зноў сказаў людзям: "З прарокаў Госпада застаўся я адзін, а прарокаў Бааля тут трыста пацьдзесят, і прарокаў мерзкіх чатырыста". І сказаў зноў Ільля: "Дайце мне двух цялят. Хай яны выбяруць сабе адно цяля заб'юць яго і паложаць на дровы, але агня хай не раскладаюць.Я таксама заб'ю адно цяля, палажу яго на дровы і таксама агня не запалю. Тады вы будзеце клікаць вашага бога, а пасьля я буду клікаць самога Госпада Бога майго: і Бог, які выслухае і адкажа агнём, той — сапраўдны Бог". І адказалі ўсе людзі: "Добрую думку даў Ільля, хай будзе так". Тады Ільля сказаў прарокам мерзкім: "Выбірайце вы першыя, бо вас больш. Тады клічце вашага бога, але агня не раскладайце". Яны ўзялі цяля і

забілі яго, а пасьля клікалі Бааля ад раніцы да паўдня, крычачы: "Бааль, выслухай нас!". Але не было ні голасу, ні адказу. Тады пачалі біць паклоны перад ахвярнікам, які яны прыгатавлі. Настаў поўдзень, і Ільля пачаў насьміхацца з іх, кажучы: "Крычыце мацней, бо можа бог ваш не чуе: магчыма ён размаўляе, або заняты , або выбіраецца ў дарогу? А можа ён сьпіць, дык няхай прачнецца!". Тады яны пачалі крычаць яшчэ мацней і, паводле звычаю свайго, калечыць сябе нажамі і бічавацца аж да крыві. І прарочылі яны, аж пакуль прыйшоў вечар і настаў час ахвяры вячэрняй, а усё не было адказу. Тады Ільля сказаў прарокам: "Адступіцеся цяпер, і я прынясу маю ахвяру". І яны адступіліся і замоўклі. Ільля сказаў людзям: "Падыдзіце да мяне".І ўсе людзі падышлі да яго. І ўзяў Ільля дванаццаць каменяў, паводле ліку пакаленьняў сыноў Ізраіля, якому Госпад сказаў: "Імя тваё будзе Ізраіль". І паклаў камяні ў імя Госпада, і направіў развалены ахвярнік, і выкапаў вакол ахвярніка роў, у якім можна было пасеяць дзьве меры насеньня. Потым палажыў дровы і, забіўшы цяля, палажыў яго на дровах і загадаў: "Напоўніце чатыры збаны вадою і вылійце яе на дровы і ў роў". Так яны і зрабілі. Тады ён зноў загадаў:"Паўтарыце тое самае!". І яны паўтарылі. І зноў загадаў: "Яшчэ трэці раз!". Яны зрабілі тое самае трэці раз, так што вада абліла ўвесь ахвярнік і напоўніла роў.

І ўсклікнуў Ільля да неба, кажучы: "Госпадзе Божа Абрагама, Ісаака і Якуба! Выслухай мяне, Госпадзе! Выслухай мяне агнём! Хай сёньня станецца вядомым, што Ты адзіны Госпад Бог Ізраіля, а я, слуга Твой, на Твой загад усё гэта ўчыніў.І навярні сэрцы людзей гэтых да Цябе". І вось агонь зышоў з неба ад Госпада, і спаліў цэласпальныя ахвяры і дровы і камяні, а балота і ваду , што была ў рове, высушыў. Усе людзі, бачыўшы гэта, палі тварам ніц, і сказалі: "Сапраўды Госпад Бог зьяўляецца Богам праўдзівым!". Ільля ж загадаў ім: "Хапайце прарокаў Бааля! Няхай ніхто з іх не застанецца!". І адразу схапілі іх. І Ільля завёў іх да ручая Кішон і там іх пазабіваў.Тады Ільля сказаў Ахабу: "Чую шум дажджу, сядзь на калясьніцу тваю і едзь, каб дождж цябе не застаў". І ўзышоў Ільля на Кармэльскую гару, і пахіліўся да зямлі, утуліўшы твар між каленаў, і памаліўся да Госпада. І вось неба пацямнела ад хмараў і ветру і пайшоў лівень. І заплакаў Ахаб і пайшоў да Іезрааля. І рука Гасподняя была на Ільлі, і ён падперазаўшы паясьніцу сваю, пайшоў перад Ахабам да Іезрааля. Калі Ахаб расказаў жонцы сваёй Іезабэлі усё, што ўчыніў Ільля і як ён мячом пазабіваў прарокаў, яна паслала пасланца да Ільлі, каб сказаць: "Заўтра я зраблю з жыцьцём тваім так, як ты зрабіў з жыцьцём кожнага з іх". Пачуўшы гэта Ільля спалохаўся і, ратуючыся ўцечкаю, прыйшоў у Баршэбу, што ў зямлі Юдэйскай.Там ён пакінуў слугу свайго, а сам пайшоў на дзень дарогі ў пустыню. Прыйшоўшы, сеў пад ядлаўцом і, жадаючы сьмерці, казаў: "Ужо

вялікі час, Госпадзе! Вазьмі душу маю, бо я ня лепшы за маіх продкаў". Пасьля лёг і заснуў. І вось анёл, штурхнуўшы яго, сказаў: "Устань, еш!". Ільля глянуў і ўбачыў ля галавы праснак і збан вады. Тады, устаўшы, ён пад'еў і выпіў, і лёг зноў. Анёл вярнуўся і другі раз, штурхнуўшы яго, сказаў: "Устань і еш, бо цябе чакае вялікая дарога". Дык, устаўшы, зьеў і выпіў. Тады, падмацаваны ежаю, ён ішоў сорак дзён і сорак начэй аж да сьвятой гары Гарэб. Там увайшоў у пячору адпачыць. І Госпад прамовіў да яго, кажучы: "Выйдзі і стань ля гары перад Госпадам!". І вось Госпад прайшоў міма. Быў вялізны вецер, што развальваў горы і крышыў скалы, але Госпад ня быў у ветры. Пасьля ветру — землятрус: Госпад ня быў у землятрусе. Пасьля землятрусу прыйшоў агонь : Госпад ня быў у агні. А пасьля гэтага агню — подых лагоднага ветрыку. Калі Ільля пачуў яго, ён выйшаў і стаў пры ўваходзе пячоры, засланіўшы твар плашчом. Тады Госпад сказаў яму: "Ідзі назад у пустыню Дамаскаву і памаж Елісея, сына Шафата, на прарока на твaё месца!"

**Чытаньне чацьвертай кнігі царстваў** (*3, 19:19-21; 4,2:1,6-14*)

У той час Ільля пайшоў і знайшоў Елісея, сына Шафата, які араў валамі. Падышоўшы да яго, Ільля накінуў на яго свой плашч. І Елісей пакінуў валы і пайшоў усьлед за Ільлёю і служыў яму.І вось Ільля быў узяты Госпадам у ветры на неба, а сталася гэта такім чынам. Ільля і Елісей ішлі да Галгалы. І сказаў Ільля Елісею: "Застанься тут, бо Госпад паслаў мяне да Ярдану". Але Елісей адказаў: "Як жывы Госпад, і жывая душа мая, не пакіну цябе". І пайшлі абодвы яны далей і сталі ля Ярдану, а пяцьдзесят мужоў, вучняў прароцкіх, прыйшлі і сталі насупраць здалёку. І ўзяў Ільля плашч свой, скруціў яго і ударыў ім ваду, якая разьдзялілася на два бакі. І яны прайшлі па сухім дне. І калі яны прайшлі, Ільля сказаў Елісею: "Прасі, што мне зрабіць перад тым, чым буду узяты ад цябе". Елісей адказаў: "Хай дух, што ў табе, будзе падвойным ува мне". Кажа Ільля: "Цяжкай рэчы просіш; калі ўбачыш мяне, як буду ўзяты ад цябе, тваё жаданьне споўніцца". Калі яны так ішлі і размаўлялі, вось зьявілася вогненная калясьніца з вогненнымі канямі, і разлучыла іх. І Ільля ў ветры вялікім узьнёсься да неба. А Елісей глядзеў і крычаў: "Ойча ! Ойча ! Вось калясьніца Ізраіля і ягоныя ездакі!". І ўжо больш ня бачыў яго. І Елісей, узяўшы вопратку сваю, разадраў яе і ўзяў плашч Ільлі, што ўпаў згары. Вярнуўшыся, Елісей стаў на беразе Ярдану і, ўзяўшы плашч Ільлі, што ўпаў згары, удрыў ім ваду, але яна не разьдзялілася.Тады крыкнуў ён: "Дзе ж гэта Госпад Бог Ільлі, дзе Ён?". І ўдарыў ваду другі раз, і яна расступілася, і ён перайшоў па сухім дне.

Вершапесьні

(*Тон 8*). Ільля, прарок дзіўны, розум свой набожнасьцю прасьвятліў і, бачыўшы несправядлівы суд нягоднага цара, абурыўся і абвясьціў яму Божы прысуд, і царыцу нязбожную і залаталюбную Божаму суду аддаў. Малітвамі прарока твайго Ільлі, Хрысьце, збаў душы нашы.

*Верш.* Майсей і Аарон сярод сьвятароў Яго, і Самуіл сярод тых, што клічуць імя Яго.

"Дакуль, Госпадзе, шлях нязбожных будзе пасьпяваць — ты, прароча, усклікнуў. — Ты насадзіў і яны ўкараніліся і ўзрасьцілі плод неправеднасьці. І згінуць яны ў сваіх бясчынствах: будуць клікаць Цябе, але Ты не пачуеш іх. Чаму паказаў Ты мне агіднасьць судзьдзяў неправедных?".

*Верш.* Ты — сьвятар давеку, паводле чыну Мельхісадэка.

Пачэсны і вялікі прароча Ільля, малітвамі тваімі выбаўляй ад бедаў і суму, і варожых напасьцяў тых, што сьвяткуюць тваё ўзыходжаньне, каб усе хрысьціяне заўжды шанавалі і славілі цябе.

Слава....

(*Тон 6*). Прароча і прапаведніча прыйсьця Хрыстовага, ты заўжды прабываеш ля пасаду Велічы і, служачы на вышынях, заступаешся за ўсіх у патрэбе і, ўсюды праслаўлены, сусьвет бласлаўляеш. Прасі ачышчэньня душам нашым.

Цяпер....

(*Тон 6*). Тварэц і Збавіцель мой, Усячыстая, Госпад Хрыстос, выйшаўшы з улоньня твайго, у мяне апрануўся і ад першага Адамавага праклёну вызваліў. Дзеля гэтага табе, Бязьвінная, як Маці Божай і Дзеве, разам з анёламі нязмоўкна ўсклікаем "Радуйся!". Радуйся, Уладарка, Заступніца, Абарона і Збаўленьне душ нашых.

Адпушчальныя трапары

**Трапар Прароку** (*тон 4*). Анёл у целе, пракокаў аснова, другі прадвесьнік прыйсьця Хрыстовага, Ільля слаўны, з вышыні паслаў Елісею падвойную ласку немачы адганяць і пракажоных ачышчаць, і тым, што шануюць яго, шле аздараўленьні.

Слава .... цяпер .....

*Багародзічны (Тон 4).* Тайна спрадвеку ўкрытая і анёлам няведамая, Табою, Багародзіца, тым, што жывуць на зямлі, сталася яўнаю: Бог прыняў цела ад Цябе, спалучыўшы ў сабе без зьліцьця дзьве прыроды і, пацярпеўшы дзеля нас дабравольна на крыжы, уваскрасіў ім першастворанага і выбавіў ад сьмерці душы нашы.

## ЮТРАНЬ

**Пасьля " Госпад — Бог..":**

*Трапар прареока двойчы, і Багародзічны (гл. вышэй)*

**Сядальныя песьні 1** (*Тон 1*). На вогненнай калясьніцы, быццам на крылах ветру, ты ўзьнёсься ў славе на неба, прарочa Божы, даўшы з неба Елісею разамм з плашчом тваім падвойную ласку.

Слава... цяпер...: Прыбягаем з любоўю да Тваёй дабраты і вызнаем Цябе як Маці Божую, што пасьля родаў засталася Дзеваю, і молім Цябе, бо Ты, адзіная беззаганная, наша заступніца, і ў Табе мы знайшлі збаўленьне ад напасьцяў.

**Сядальныя песьні 2.** (*Тон 3*). Сьвятыня твая, цудоўны прарочa, дае ўсім аздараўленьні, калі ты разам з Елісеем моліш Хрыста, каб Ён паслаў сьвету супакой, і веліч зьмілаваньня людзям, якія з любоўю шануюць цябе.

Слава... цяпер...: Кожны слушна прыбягае туды, дзе збаўляецца. Дзе ж знойдзем лепшы прытулак, як у Цябе, Багародзіца, што ахоўваеш душы нашыя?

*Пасьля паліелею, узьвялічваньне:*

Узьвялічваем цябе, прарочa слаўны Ільля, і шануем Твой на вогненнай калясьніцы да неба ўзыход.

*Верш 1.* Вось я пайшоў і пасяліўся ў пустыні.

*Верш 2.* Я расказаў пра Тваю вернасьць і Тваё збаўленьне.

Слава... Цяпер...

Алілуя, Алілуя, Алілуя. Слава Табе, Божа! (*Тройчы*)

**Сядальная песьня** (*тон 8*). Палюбіўшы мудрасьць, ты, пачэсны прарочa, выкрыў неправеднага цара і пераканаў людзей, якія ўсклікнулі: "Сапраўды Бог, якога Ільля прапаведуе, — адзіны". І Езабэлі ты дакараў за грабежніцтва і грэхалюбства. Прарочa і прадвесьніку прыйсьця Хрыстовага, Ільля слаўны, малі цяпер Хрыста Бога даць адушчэньне грахоў тым, што з вераю спраўляюць памяць тваю.

Слава... цяпер...: Усе плямёны людзкія славяць Цябе як Дзеву і адзіную сарод жанчынаў, штіюо без семя нарадзіла Бога ў целе. Боства агонь пасяліўся ў Табе і Ты карміла як немаўля Тварца і Госпада. Дзела гэтага анёлы і людзі дастойна славяць сьвятое сынараджэньне Тваё, і дружна ўсклікаюць: "Малі Хрыста Бога, каб Ён дараваў адпушчэньне грахоў нам, якія з вераю пакланяемся усесьвятом сынараджэньню Твайму".

**Узыходныя песьні**: *першы антыфан 4 тону*.

**Пракімен**. Ты — сьвятар давеку паводле чыну Мальхісадэка.
*Верш*. Сказаў Госпад Госпаду майму: Сядзь па правай руцэ маёй, пакуль пкладу ворагаў Тваіх пад ногі Табе.

**Евангельле**: Лк 4:22-30

*Пасьля Пс 50:*

Слава...: Малітвамі прарока Твайго, Міласэрны, ачысьці мноства правінаў нашых.

Цяпер...: Малітвамі Багародзіцы...

Зьмілуйся нада мною...: (*Тон 4*). На вогненнай калясьніцы, Ільля Тэсьбіцянін, ты быў узьнесены на хмары і перасяліўся ў сьветлую краіну, пасароміўшы ілжывых прарокаў. Ты, што словам зьвязаў неба, разьвяжы цяпер путы нашых правінаў малітвамі тваімі да Госпада, і збаў душы нашыя.

**Канон**

***Песьня 1***. *Ірмас (Тон 8).* Перайшоўшы мора быццам сушу, і пазьбегнуўшы ягіпскага зла, ізраільцянін усклікнуў: Збавіцелю нашаму пяём.

*Катавасія.* Адчыню вусны мае, і напоўняцца Духам; слова скажу ў гонар Уладаркі Маці, і стану сьвяткаваць сьветлую ўрачыстасьць і славіць радасна ў песьнях цуды Яе.

***Песьня 3***. *Ірмас.* Госпадзе, Творча нябеснага кругу і Заснавальніку царквы, мэта жаданьняў і ўмацаваньне верных, умацуй мяне ў любові Тваёй, адзіны Чалавекалюбча.

*Катавасія..* У боскай славе Тваёй, Багародзіца, жывая і невычэрпная Крыніца, умацуй аднадушны хор песьняроў Тваіх і зрабі іх дастойнымі вянцоў славы.

***Сядальная песьня*** *(тон 8).* Крыніцу цудаў, пракокаў красу, Ільлю Тэсьбіцяніна ў песьнях, верныя, усхвалім: не пакаштаваўшы сьмерці цлялеснай, ён запэўніаве мёртвых у ўваскрасеньні. Маючы ласку ў Бога, ён дае аздараўленьні тым, што з вераю просяць, і моліцца Хрысту, каб Ён дарваў адпушчэньне правінаў тым, што спраўляюць ягоную сьветлую памяць.

Слава.. цяпер...: Падаючы пад нападамі бачных і нябачных ворагаў і топячыся ў буры шматлікіх правінаў маіх, я ўцяакаю да Тваёй , Чыстая, дабрыні, шукаючы заступніцтва і аховы. Маліся , Усячыстая, да Таго, хто без сема прыняў цела ад Цябе, за слугаў Тваіх, якія моляцца Табе, Багародзіца ўсячыстая, і прасі Яго няспынна, каб Ён дараваў адпушчэньне правінаў тым што дастойна пяюць славу Тваю.

***Песьня 4.*** *Ірмас.* Я пачуў, Госпадзе, провіду Твайго тайну, зразумеў дзеяньні Твае і ўславіў Боства Тваё.

*Катавасія..* Хрыстос, Бог спрадвечны, што сядзіць у славе на боскім пасадзе, прыходзіць на хуткай хмары і нятленнай рукою збаўляе тых, што клічуць: "Слава, Хрысьце, сіле Тваёй!"

***Песьня 5.*** *Ірмас.* Прасьвятлі нас зпаветамі Тваімі, Госпадзе, і рукою Тваёю высокаю дай нам Твой супакой, Чалавека-любча.

*Катавасія..* Усё стварэньне сумелася, убачыўшы боскую славу Тваю: Ты, Дзева, што мужа ня знала, мела ва ўлоньні Бога ўсіх і нарадзіла спрадвечнага Сына, які дае супакой усім, што славяць Цябе.

***Песьня 6.*** *Ірмас.* Малітву занясу да Госпада, і аб'яўлю Яму жаль мой, бо душа мая напоўнілася ўсякага зла, і жыцьцё маё да пекла наблізілася, дык малюся як Ёна: выведзі мяне, Божа , ад тленнасьці.

*Катавасія..* На гэтую боскую і слаўную ўрачыстасьць Божай Маці прыйдзіце, усе багамудрыя, пляскайце ў далоні і слаўце Таго, хто нарадзіўся ад Яе.

***Кандак*** *(тон 2).* Прароча і прадвесьніча вялікіх спраў Бога нашага, Ільля ўсяслаўны, што вадацечныя хмары словам сваім навёў, малі за нас адзінага Чалавекалюбца.

*Ікас.* Вялікія беззаконьні людзей, але ж і вялікае Божае чалавекалюбства. Дарма прарок Ільля хвалюецца і поўніцца гневам, і неміласэрныя словы ўзносіць да Міласэрнага , клічучы: "Пакажы гнеў Твой на тых, што адкінулі Цябе, праведны

Судзьдзя!" Аднак ён ня змог пераканаць Усядобрага, каб той пакараў тых, што адкінулі Яго, бо ня сьмерці а пакаяньня ўсіх хоча адзіны Чалавекалюбец.

***Песьня 7.*** *Ірмас*. Юнакі юдэйскія ў Бабілёне некалі патройнаю вераю полымя агню патушылі, пяючы: Блаславёны Ты, Божа айцоў нашых.

*Катавасія*.. Мужныя і багамудрыя юнакі, не захацеўшы служыць стварэньню замест Творцы, вогненнае выпрабаваньне за нішто палічыўшы, радасна сьпявалі: "Усяхвальны Госпад і Бог айцоў, блаславёны Ты".

***Песьня 8.*** *Ірмас.* Уладара нябеснага, якога хваляць анельскія хоры, слаўце і ўзьвялічвайце праз усе вякі.

*Катавасія*.. Народжаны ад Багародзіцы набожных юнакоў у печы выбавіў; тады вобразна, а цяпер дзейсна натхняе Ён увесь сьвет пяяць: "Слаўце, усе стварэньні, Госпада і ўзьвялічвайце Яго на ўсе вякі".

**Песьня 9.** *Ірмас.* Сапраўднай Багародзіцаю вызнаем Цябе, Дзева чыстая, і з анельскімі хорамі славім Цябе.

*Прыпеў*. Сьвяты прароча Ільля, малі Бога за нас.

Ты быў прасьветлены сьветласьцю духоўнаю жыцьцядайнае Тройцы , прарок Ільля. Дзеля гэтага мы ўсе вызняем цябе як малельніка за сьвет перад Богам.

*Прыпеў*. Сьвяты прароча Ільля, малі Бога за нас.

Мы пазналі цябе, боскі прароча, як анёла на зямлі і Божага чалавека ў небе. Сам Госпад сказаў: "Ты, Ільля — чалавек жорсткі, ня можаш цярпець Ізраіля, які зграшыў. Дык узыдзі на неба да Мяне, а Я зыду ўніз на зямлю".

*Прыпеў*. Сьвяты прароча Ільля, малі Бога за нас.

Ты , прароча Божы, жыў на зямлі як бесьцялесны анёл. А цяпер, узьнесены на неба, ты цешышся з анёламі і пазіраеш на нас, якія праслаўляем цебе, блаславёны.

Слава..., цяпер...: Ты, Чыстая, носіш на руках Бога, які носіць усё, і корміш Таго, хто корміць усё стварэньне і стаўся падобным да нас. Малі Яго даць людзям Тваім вызваленьне ад усяго злога.

*Катавасія.*. Усе народжаныя на зямлі хай усьцешацца, прасьветленыя Духам. Хай сьвяткуюць бесьцялесныя анельскія хоры і ўшануюць урачыстасьць Божае Маці, і хай пяюць: "Радуйся, блаславёная Багародзіца, чыстая заўсёды Дзева!"

**Экзапастыляр.** Сьветласьць, што апрамяніла цябе, калі ты, Ільля, быццам рыцар у зброі, на чатырохконнай калясьніцы узносіўся на неба, не спаліла цябе, які палымяным словам сваім зьвёў агонь на зямлю і высушыў хмары.

Слава...: На вогненнай калясьніцы ты ўзьняўся на небесныя кругі. Цяпер, будучы побач са Сьвятлом і ўзіраючыся на тых, што спраўляюць памяць тваю, прасьвятлі наш розум.

Цяпер...: Ты, Багародзіца — прычына дабротаў, якія Бог даў сьвету. Малі ўсядобрага Бога за збаўленьне ўсіх.

**Пахвальныя псалмы**

(*Тон 8*). Калі ты, дзіўны прароча, дабрадзейнасьцямі і чыстым жыцьцём дагадзіў Богу, і зьяднаўся з Ім, ты атрымаў дар пазнаваць прыроду тварэньняў, і словам зачыніў хмары і паклікаў з неба агонь, каб зьнішчыць ворагаў. Маліся за збаўленьне душаў нашых.

Загарэўшыся руплівасьцю за Госпада, ты, блаславёны, выкрыў беззаконных цароў, вугубіў нязбожных сьвятароў і вадою агонь распаліў. Ты памножыў запас ежы, ня ўзрошчанай зямлёю, і воды Ярдану плашчом разьдзяліў. Маліся за збаўленьне душаў нашых.

Жывучы на зямлі як анёл, ты, прароча, узбагаціўся духоўнымі дарамі. Словам тваім ты мёртвага юнака ўваскрасіў, і сам не зазнаў сьмерці, сеўшы на вогненную калясьніцу і узьняўшыся на вышыню. Маліся за збаўленьне душаў нашых.

(*Тон 1*). Ільля руплівы, утаймаваўшы свае пажаданьні, сёння бярэцца на неба і цудоўным спосабам накіроўвае ўсіх да збаўленьня. Краса пракокаў і анёл у целе, ён годны нябеснай славы, бо сваімі подзьвігамі ён явіў сябе як нябесны чалавек. Дык уславім яго, кажучы: "Будзь нам заступнікам, мудры, у судны дзень".

Духоўнымі песьнямі ўславім прарокаў, Ільлю Тэсьбіцяніна, які ўзышоў на неба, і Елісея, які разам з плашчом атрымаў падвойную ласку ад Бога. Яны явіліся сьветачамі сусьветнымі, і сёньня моляцца за нашыя душы.

Падобна Давіду, сёньня, верныя, у песьнях уславім прарока Господняга, Ільлю Тэсьбіцяніна, які словам зачыніў неба быццам палатку, і ўрадлівую зямлю зрабіў няплоднаю. Слаўны цуд! Зямны чалавек не дазваляе нябёсам дождж даць. Тленны чалавек апрануўся ў нятленнасьць, узьнёсься на неба на вогненнай калясьніцы, разам з плашчом даў Елісею падвойную ласку, выкрыў цара, і непакорлівых людзей голадам пакараў, мерзкіх сьвятароў пасароміў, і ўдовінага сына словам уваскрасіў. Малітвамі яго, Хрысьце Божа наш, захавай у супакоі прававерных хрысьціянаў і дай ім перамогу над усімі нягодамі.

Слава...

(*Тон 8*). Уславім, верныя, у песьнях Ільлю і Елісея, вызначных прарокаў і ясныя сьветачы сусьветныя, і запяем радасна Хрысту: Міласэрны Госпадзе, малітвамі Тваіх прарокаў дай людзям Тваім адпушчэньне правінаў і веліч зьмілаваньня.

Цяпер...

Прымі, Уладарка, маленьні слугаў Тваіх, і вызваль нас ад усякай бады і суму.

*Пасьля Вялікага ўслаўленьня Трапар Прарока; слава... цяпер... Багародзічны..(гл. бач.17)*

ЛІТУРГІЯ

***Трапар Пароку*** *(тон 4).* Анёл у целе, прарокаў аснова, другі прадвесьнік прыйсьця Хрыстовага, Ільля слаўны, з вышыні паслаў Елісею падвойную ласку немачы адганяць і пракажоных ачышчаць, і тым, што шануюць яго, шле аздараўленьні.

***Кандак*** *(тон 2).* Прароча і прадвесьніча вялікіх спраў Бога нашага, Ільля ўсяслаўны, што вадацечныя хмары словам сваім навёў, малі за нас адзінага Чалавекалюбца.

***Пракімен*** *(Пс 109:4,1).* Ты сьвятар давеку паводле чыну Мальхісадэка.

*Верш.* Сказаў Госпад Госпаду майму: Сядзь па правай руцэ маёй, пакуль пакладу ворагаў тваіх падножкам для ног тваіх.

**Апостал**: Як 5:10-20

***Алілуя*** *(Пс 98:6; 33:18).* Майсей і Аарон сярод сьвятароў Яго, і Самуіл сярод тых, што клічуць імя Яго.

*Верш.* Усклікнулі праведнікі і Госпад пачуў іх , і ад усіх бедаў выбавіў іх.

**Евангельле**: Лк. 4:22-30

***Прычасьнік*** *(Пс 111:6-7).* Памяць праведніка жыць будзе вечна: благое весткі ён не збаіцца. Алілуя, алілуя, алілуя.

## 22 ліпеня

## СЬВЯТОЕ І РОЎНАЕ АПОСТАЛАМ МАРЫІ МАГДАЛЕНЫ

### ВЯЧЭРНЯ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

(*Тон 8*). Несучы міра са сьлязамі ты, Магдалена Марыя, прыйшла да магілы Збавіцеля і ўбачыла там анёла славы, які абвясьціў табе ўваскрасеньне Жыцьцядаўца і збаўленьне ўсіх; і ты пасьпяшыла занесьці радасную вестку адзінаццацём апосталам, кажучы ім: "Весяліцеся, бо Хрыстос уваскрос!"

Паслугоўваючы Хрысту Богу, які дзеля нас стаўся адным з нас, і прасьвятліўшы душу і розум нязгасным сьвятлом, ты, усяхвальная Марыя, сама сталася сьвятлом, і, бачачы Настаўніка твайго павешанага на крыжы, усклікнула са сьлязамі: "Як гэта сёньня Жыцьцё дабравольна прымае сьмерць?"

Хрыстос, як агароднік, зьявіўся Марыі, тушачы духоўную смагу расою слова свайго, і сказаў ёй: "Ідзі да братоў маіх і абвясьці радасьць ім! Бо я адыходжу да Айца і Бога майго, і Бога вашага, каб дараваць сьвету багацьце зьмілаваньня."

Слава...

(*Тон 6*). Ты першая, Марыя Магдалена, бачыла ўваскрасеньне Віноўніка ўсяго добрага, які нашу прыроду абагавіў; Ты была першай дабравесьніцай, сказаўшы апосталам: "Пакіньце сум, прыміце радасьць і ідзіце бачыць уваскрослага Хрыста, які дае сьвету багацьце зьмілаваньня свайго".

Цяпер...

*Багародзічны (тон 6).* Мы пазналі Бога, які нарадзіўся ад цябе, Багародзіца. Малі Яго за збаўленьне душ нашых.

*Крыжабагародзічны (тон 6).* Бачачы Цябе на крыжы павешанага, Хрысьце, Маці Твая ўсклікнула: "Што гэта за страшную тайну бачу, Сыне мой? Як гэта Ты, Жыцьцядаўча, паміраеш на крыжы?"

**Вершапесьні**: *дня адпаведнага тону*

Слава...

(*Тон 8*). Марыя Магдалена, як вучаніца, з вераю і любоўю паслужыла Хрысту Богу, які дзеля вялікай добрасардэчнасьці дабравольна стаўся ўбогім маёй убогасьцю; убачыўшы Яго на дрэве расьпятым, яна залілася сьлязамі і ўсклікнула: "Што гэта за страшнае відовішча! Як гэта мёртвым стаў Той, які ажыўляе мёртвых? Якія духмяныя алейкі прынясу Таму, хто вызваліў мяне ад дэманскага смуроду? Якія сьлёзы праліваць буду па Тым, хто прамаці маю ад сьлёз вызваліў? Уладару і Божа мой, слава Табе!"

Цяпер...

*Багародзічны.* Радуйся, сусьветная пахвала; радуйся, сьвятыня Гасподняя; радуйся, гара аценена; радуйся, усіх прыстанішча; радуйся, залаты ліхтар; радуйся, пачэсная слава верных; радуйся, Марыя, Маці Хрыста Бога; радуйся, раю; радуйся Боскі стале і залаты посудзе; радуйся, надзея ўсіх.

*Крыжабагародзічны.* Сонца, убачыўшы, як Ты, Сонца праведнасьці Госпадзе, вісіш на крыжы, скрыла праменьні свае, месяц сьвятло на цемру перамяніў, і боль пранізаў сэрца Маці Тваёй.

**Адпушчальны** трапар *(тон 8).* Усьлед за Хрыстом, які нарадзіўся ад Дзевы, ты пайшла, пачэсная Магдалена Марыя, захоўваючы ўсе Ягоныя збаўленныя рады і запаветы; дзеля гэтага сёньня мы, сьвяткуючы тваю сьветлую памяць, малітвамі тваімі атрымліваем адпушчэньне грахоў.

25 ліпеня

## УСЬПЕНЬНЕ СЬВЯТОЙ ГАННЫ

### ВЯЧЭРНЯ

**На** "Госпадзе, Цябе клічу...":

(*Тон 4*). Зьбярогшы дасканала збаўленныя законы, і паслужыўшы беззаганна Богу, ты, Ганна, сталася дастойнаю быць маці Найчыстае Дзевы, якая нарадзіла ў целе Хрыста. З ёю разам славім цябе і з радасным сэрцам сьвяткуем тваё сьвятое ўсьпеньне.

Нарадзіўшы Палату Жыцьця, ты, Багамудрая Ганна, перасталася да нятленнага жыцьця, далучыўшыся да хораў праведнікаў, што цешацца поўняю Боскай радасьці. Дзеля гэтага сёньня набожна сьвяткуем тваё, вечнапамятная, усьпеньне і з верано славім цябе.

Нарадзіўшы Браму нябесную, ты, Багамудрая Ганна, у славе ўвайшла да нябеснай сялібы, і цешышся ў асалоду Божай славаю: малітвамі тваімі зрабі і нас дастойнымі яе, адганяючы цемру пажаданьняў і туман лютых бедаў разьвяваючы.

(*Тон 1*). Дзіўны цуд! Сёньня настала сьветлая ўрачыстасьць, сонечны дзень, радасьць усяму сьвету — пачэснае і пахвалы годнае ўсьпеньне блаславёнае Ганны, ад якое нарадзілася Маці Жыцьця, духоўная Скарбніца, што зьмясьціла ў сабе незьмяшчальнае Слова, Вызваленьне ад суму, Хадайніца радасьці, якая дае ўсім багацьце зьмілаваня.

Слаўны цуд! Тая, што нарадзіла Крыніцу жыцьця, Адзіную чыстую і блаславёную сярод жанчынаў, Ганна блаславёная, сёньня пераходзіць ад жыцьця дачаснага да вечнага, будучы ўзятай ад зямлі на неба, каб там прабываць у радасьці разам з анёлаў хорамі. І мы сьвяткуем сёньня радасна яе ўрачыстасьць.

Сёньня сьветлая ўрачыстасьць настала для ўсіх верных, бо мы, натхнёныя Божым Духам, сьвяткуем тваё, пахвалы годная Ганна, пачэснае ўсьпеньне; прыйшла да нас ласка аздараўленьняў, што адганяе злых духаў і прасьвятляе розум сьвятлом усіх, хто з верано славіць тваё слаўнае перастаўленьне.

Слава... цяпер...

(*Тон 8*). Ад няплоднай пары, сьвятых Якіма і Ганны, вырасла сьвятая галінка, Бязьвіная Багародзіца, ад якое зазьзяла сьвету Збаўленьне — Хрыстос Бог. Пераставіўшыся да нябесных сялібаў, вы разам з вашай дачкою, Найсьвятою Дзевай Марыяй, і з анёламі радуецеся і моліцеся за ўвесь сьвет.Дзеля гэтага і мы славім вас у песьнях і просім шчыра: "Стаўшыся прабацькамі Хрыстовымі дзеля Багародзіцы, маліцеся за душы нашы".

**Вершапесьні**

(*Тон 5*). Радуйся, духоўная ластаўка, што, пражыўшы чыста і дабрадзейна, абвясьціла нам вясну ласкі, скарбніцу дзявоцтва, стаўшыся маці адзінай бязьвіннай Багародзіцы, якая нарадзіла словам Слова, Ягнё, што ўзяло на сябе грахі сьвету — Хрыста Бога,

які і перасяліў цябе, усехвальная Ганна, ад зямлі. Малі Яго сёньня дараваць нам багацьце зьмілаваньня.

*Верш.* Радуйцеся, праведнкі, ў Госпадзе: хвала пасуе праведным.

Радуйся, Богу мілая пачэсная пара, упрыгожаная сьвятасьцю Закону, што ласкаю Божаю падаравала нам Маці Хрыста, Начальніка жыцьця нашага: Якіме слаўны і Ганна блаславёная, два сьветачы, якія далі сьвету Сьвячу ласкі — Багародзіцу Дзеву.З ёю разам маліцеся, каб атрымаць душам нашым багацьце зьмілаваньня.

*Верш.* Шчасьлівыя ўсе, што баяцца Госпада і ходзяць па Ягоным шляху.

Радуйся, блаславёная зямля, якая выдала сьвету зямлю, што ўзрасьціла нам Бога. Зрабіўшы закон Божы правілам жыцьця твайго, ты здабыла ласку ўсім, разарваўшы бяздзетнасьці путы; у сьмерці ты знайшла нятленнасьць, перастаўіўшыся да непрамінальнага сьвятла, Ганна блаславёная, прамаці Хрыста Бога, маці Багародзіцы — сьветланоснага Сьветача. З ёю разам выпрасі багацьце зьмілаваньня душам нашым.

Слава... цяпер...

(*Тон 8*). Прыйдзіце, верныя, у песьнях уславім Багамудрую Ганну, якая нарадзіла Чыстую Дзеву — Гару Божую, і сёньня адышла да нябесных сялібаў. Усклікнем ёй усе: "Блаславёнае ўлоньне тваё, якое насіла тую, што зьмясьціла ў сабе Сьвятло сьвету; блаславёныя грудзі твае, што кармілі тую, якая ўзрасьціла Хрыста — спажыву нашага жыцьця. Малі Яго выбавіць нас ад усякага суму і варожых напасьцяў і збавіць душы нашы".

**Адпушчальны трапар**

(*Тон 4*). Ты, Ганна багамудрая, насіла ва ўлоньні тваім Усячыстую Маці Божую, якая нарадзіла Жыцьцё; дзеля гэтага ты сёньня ў славе перайшла да нябеснага жылья, атрымаўшы ў спадчыне ўдзел з усімі, якія вечна прабываюць у радасьці, просячы адпушчэньня грахоў для тых, што з любоўю шануюць цябе, вечна блаславёная.

ЛІТУРГІЯ

*Трапар (Тон 4).* Ты, Ганна багамудрая....

***Кандак*** *(тон 2)*. Сьвяткуючы памяць прабацькоў Хрыстовых, просім даверліва іхняй помачы, каб выбавіцца ад усякага суму ўсім, якія клічуць: "Божа, які ў дабраце Тваёй захацеў праславіць іх, будзь з намі заўсёды".

***Пракімен*** *(Пс 67:36,27)*. Дзіўны Бог у сьвятых сваіх, Бог Ізраіля.

*Верш*. На зборах вашых блаславіце Госпада, усе нашчадкі Ізраіля.

**Апостал**: Гал 4:22-27

***Алілуя*** *(Пс 39:2; 33:20)*. Спадзяваўся я на Госпада, спадзяваўся цьвёрда, і Ён, схіліўшыся нада мною, пачуў кліч мой.

*Верш*. Шмат бедаў прыйшлося зазнаць праведніку, і ад усіх іх выбавіў яго Госпад.

***Евангельле***: Лк 8:16-21

## 27 ліпеня

## СЬВЯТОГА ВЯЛІКАМУЧАНІКА І ЛЕКАРА ПАНЦЯЛЕЙМАНА

### ВЯЧЭРНЯ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

(*Тон 4*). Ты быў справядліва названы Панцялейманам, бо, ацаляючы цялесныя немачы людзей, ты праяўляў клопат аб іхніх душах. Дзеля гэтага ты атрымаў імя ўсеміласэрнага і прыняў заплату за дабрачыннасьць і ўзнагароду за набожнасьць, паказаўшыся непераможным жаўнерам Хрыста Бога нашага, якому маліся за збаўленьне душаў нашых.

Зачэрпнуўшы з духоўнай збавеннай крыніцы дар ацаленьняў, ты раздаеш яго шчодра ўсім, хто прыходзіць да цябе, і прасьвятляеш ласкаю Божаю тых, што радасна сьвяткуюць сьветлую і слаўную памяць тваю. Богападабнае імя тваё яўна сьведчыць аб дабрыні, што ў табе: маліся стацца годнымі яе і тым, што шануюць цябе.

У шматлікіх мучэньнях, быццам у агні гартаваныя, выпрабоўваліся твае жаданьні і любоў. Церпячы мукі на моры і ў агні, ты перамог начальніка зла і атрымаў шчодры і жыцьцядайны дар Суцяшальніка. Умацаваны ім, ты вярнуў мёртваму жыцьцё і учыніў безьліч ацаленьняў, богамудры і блаславёны Панцялеймане.

Слава ...

(*Тон 6*). Сёньня зазьзяла нам памяць бескарысьлівага лекара, клічучы нас на тайнае застольле і радасную ўрачыстасьць: Сёньня нам даецца цудадзейны лекар Панцялейман, цьвёрды і непахісны мучанік, які лечыць немачы ўсіх і моліцца шчыра Госпаду за збаўленьне душ нашых.

Цяпер...

*Багародзічны.* Бога ад цябе народжанага мы пазналі, Багародзіца Дзева: малі Яго за збаўленьне душ нашых.

*Крыжабагародзічны.* Беззаганная Дзева і Чыстая ўладарка, бачачы Сына свайго ўзьнесенага на крыжы, па-матчынаму заплакала і ў зьдзіўленьні ўсклікнула: "Дзіця маё мілае, што гэта бачу я? Як гэта няўдзячныя людзі аддалі Цябе Пілату на суд і засудзілі на сьмерць Жыцьцё ўсіх? Слаўлю Тваю, Слова, невыказную спагадлівасьць"

**Вершапесьні:** *актойху*

Слава ....

(*Тон 8*). Палюбіўшы набожнасьць маці, і адкінуўшы бязбожжа бацькі, ты стаўся воем Лекара душаў, і сам атрымаў дар ацаленьняў. Узмоцнены Божай ласкаю, ты быў зьнішчальнікам грэшных пажаданьняў і лекарам душаў. Цярпеньнямі і малітвамі тваімі ты, мучаніку Хрыстовы Панцялеймане, здабыў няпрамінальнае жыцьцё. Цяпер маліся за збаўленьне душаў нашых.

Цяпер .....

*Багародзічны.* Пад Тваю апеку прыбягаю, Дзева Сьвятая Багародзіца: ведаю, што праз Цябе змагу атрымаць збаўленьне, бо Ты, Чыстая, можаш памагчы мне.

*Крыжабагародзічны.* Сонца, убачыўшы, як Ты, Сонца праведнасьці Госпадзе, вісіш на крыжы, схавала промні свае, месяц сьвятло на цемру перамяніў, і нясьцерпны боль паранізаў сэрца Маці Тваёй.

**Адпушчальны трапар**

(*Тон 3*). Сьвяты пакутніку і лекару Панцялеймане, малі міласэрнага Бога, каб Ён дараваў душам нашым адпушчэньне грахоў.